**Л.Я. Глазман**
Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава
e-mail: Lubov_glazman@bk.ru

УДК 821.161.3.09(092)+821.161.09(092)

**МАСТАЦКІЯ ПРЫЁМЫ ПЕРАДАЧЫ СВЕТААДЧУВАННЯ АСОБЫ Ў АПАВЯДАННЯХ М. ГАРЭЦКАГА І Л. АНДРЭЕВА**

*Ключавыя словы: М. Гарэцкі, Л. Андрэеў, апавяданне, светаадчуванне асобы, ілюзорнасць.*

*У артыкуле даследуюцца мастацкія сродкі і прыёмы адлюстравання светаадчування асобы ў апавяданнях М. Гарэцкага і Л. Андрэева. У перадачы ўнутранага стану ў даследуемых апавяданнях найважнейшыя функцыі выконвае мастацкая ўмоўнасць з акцэнтаванай фантасмагарычнасцю, ілюзорнасцю быцця (блізкай для творчасці абодвух аўтараў), прасторава-часавая арганізацыя твораў (розная для прозы М. Гарэцкага і Л. Андрэева).*

М. Гарэцкі і Л. Андрэеў – класікі дзвюх нацыянальных літаратур, якія асабліва пільна ўглядаліся ў розныя грані маральнага стану асобы, шмат увагі надаючы асаблівасцям светаадчування сучасніка, дбаючы не толькі пра яго нацыянальную, гендарную, прафесійную ідэнтычнасць, але перадусім пра той агульначалавечы і агульнамаральны асобасны ўзровень, што прадвызначае ўсведамленне чалавекам свайго месца ў свеце. Апавяданні, якія ствараліся аўтарамі амаль адначасова або з розніцай у якое дзесяцігоддзе, маюць у адлюстраванні праблем асобы шмат агульнага: выкарыстанне сродкаў фантасмагорыі, ілюзорнасці, мастацкай умоўнасці сну, наданне значнасці прасторава-часавай арганізацыі твора. У той жа час, і беларускі, і рускі аўтары маюць адметны погляд на асобу, па-рознаму падыходзяць да праблем чалавечага быцця.

Найперш варта звярнуцца да паэтыкі ілюзіі і фантасмагорыі як найбольш частых прыёмаў, што выкарыстоўваюцца абодвума аўтарамі. Фантасмагарычныя разважанні М. Гарэцкага пра жыццё і смерць, мінулае і сучаснасць адбіліся ў апавяданнях з моцнай экспрэсіяй «Руіны» (1921), «Пакінутыя хаты» (1921). Гарэцкі ў іх з дапамогай сну звяртаецца да мінулага, перад вачамі апавядальніка то ажывае цэлая шляхецкая эпоха, то ўзнікае «старасвеччына», якой нібыта цікавіцца герой: вялізны пакой, «поўны чалавечых касцей, чарапоў і яшчэ недагнілых трупаў» [4, с. 280] – водгаласы мінулай вайны. Часавы вектар апавяданняў «Прекрасна жизнь для воскресших» (1900), «Восресение всех мертвых» Л. Андрэева з падобнай тэматыкай – напісаных, дарэчы, напярэдадні тых падзей, якія водгаласамі гучаць у «Пакінутых хатах» Гарэцкага – накіраваны ў процілеглы бок. Яны прасякнуты прадчуваннямі героем надыходзячых змен. І наколькі радасныя чаканні нейкага абнаўлення, прыбліжанага нават да рэлігійнага, у Андрэева, настолькі ж цяжкім успамінам яно суправаджаецца ў сведкі ваеннай трагедыі – беларускага аўтара.

Абодва пісьменнікі добра адчуваюць тую ілюзорнасць жыцця, якая прымушае мерыць адны і тыя ж здарэнні рознымі меркамі, на працягу гадоў то надаючы ім асаблівую значнасць, то бязлітасна адсейваючы ў разрад «драбніц». Самі героі на ўласным вопыце перажываюць гэтую адноснасць, залішнюю суб'ектыўнасць успрымання падзей: «Я ж успрымаю так, як на тое паказала маё ўзгадаванне, мой светагляд, мае пачуцці…» [4, с. 265], «вочы падманваюць» [1], «…гаварылі мы і пра жыццё, пра яго прыгажосць і багацце, пра глыбіні яго бяздонныя, над якімі бясклапотна і слепа плаваюць людзі-трэскі» [1]. Цікава, дарэчы, што амаль аднолькавы метафарычны вобраз жыцця-вадкасці і людзей у выглядзе нетрывалых трэсак, што хаатычна плывуць па паверхні, адлюстраваны абодвума пісьменнікамі (андрэеўскае «В поезде»; «Дзве душы» Гарэцкага).

Матыў ілюзіі, самападману гучыць таксама ў апавяданні Андрэева «Призраки» (1904). Дзеянне разгортваецца ў доме для вар'ятаў, але аўтар усяляк падкрэслівае звычайнасць яго жыцця, падабенства з нармальным: ён уключае ў адмысловую гульню, нароўні з прывіднасцю светаўспрымання персанажаў, і чытацкую свядомасць. У кожнага з персанажаў лякарні свая жыццёвая ўстаноўка, свае ілюзіі. Адзін з герояў стала ідэнтыфікуе сябе з Георгіем-Пераможцам, што рэгламентуе ўсё яго жыццё: бачачы сябе апорай і надзеяй грамадства, ён усё робіць з аднолькавым імпэтам і задавальненнем. Другі, наадварот, паўсюль бачыць ворагаў. Трэці знайшоў уласны спосаб выжывання: увесь час грукае ў зачыненыя дзверы. (Дарэчы, андрэеўскі матыў блукання, зачыненых дзвярэй і калідораў рэалізуецца і ў іншых яго творах: «Стена», «Возврат», «Проклятие зверя»). Доктар установы стварае вакол сябе ілюзію жыццёвага руху, ратуючыся штодзённа ў рэстараннай мітусні. Фельчарыца мяняе погляд на свет у залежнасці ад колеру шкла, праз якое глядзіць. Знаёмства з героямі стварае сітуацыю падробленасці і надуманасці, нечага фальшывага. Акрамя таго, аўтар указвае на раз'яднанасць персанажаў, кожны з якіх «занадта моцна захоплены сваёй ідэяй, каб слухаць ці чуць кагосьці» [2, с. 144]. Аднак, разам з тым, пісьменнік імкнуўся паказаць станоўчыя моманты ў разнастайнасці падыходаў да жыцця. Бо ніхто не ведае, як правільна жыць,

Рэпазіторый ВДУ

кожны выбірае нешта для сябе. Магчыма, менавіта гэта Андрэеў меў на ўвазе, калі беспаспяхова пераконваў сяброў у аптымістычнасці твора.

Матыў прывіднасці, ілюзіі выразна адлюстраваны таксама ў познім андрэеўскім творы «Возврат», герой якога апынаецца ў Маскве, нібыта па партыйных справах, і вымушаны блукаць па невядомых, варожых мясцінах. У выніку размываецца ўяўленне пра тое, хто ён, дзе і дзеля чаго знаходзіцца, пакуль не трапляе да незнаёмага дома. Пасля настойлівага і трывожнага (бо ў доме быццам бы знаходзіцца яго нявеста) грукання ў дзверы герой трапляе ў сваю турэмную камеру, якую, зноў жа, быццам і не пакідаў. Так, эпізод, напісаны ў экспрэсіяністычнай манеры з перадачай гнятлівага страху і трывогі, выводзіць простую калізію («штосьці прымроілася») на агульнафіласофскія разважанні: «хто я?» і «што я раблю?». У дадзеным выпадку, герой – чалавек, які грукае ў дзверы ўласнай камеры. Невыпадковымі з'яўляюцца таксама думкі пра здраду, якія прыходзяць у галаву героя наконт нявесты, што знікла ў апошні момант, паколькі гэтая дэталь аказваецца адным з варыянтаў тлумачэння, чаму герой зняволены, і зближае два планы: фантастычны і праўдападобны.

У кантэксце пазначанай тэмы варта таксама звярнуцца да праблемы фатальнага прадвызначэння лёсу герояў. Гэты матыў выразна гучыць у апавяданні Андрэева «Чемоданов». Над жыццём галоўнага героя апавядання «Чемоданов» вісіць нейкая таямніца, што персаніфікуецца ў вобразе Рока, з-за якога Ягор Ягоравіч увесь час пакутуе і ад якога бадзяецца па свеце. Супрацьдзейнічаюць жа злому Року «нейкія нябачныя добрыя сілы» [3, с. 79], бо Чамаданаў выратоўваецца ў самых складаных абставінах. Атрымліваецца, што героя сапраўды носіць па свеце як тую шчэпку. А таму, калі Рок усё-такі перамог і героя павесілі – па недарэчным непаразуменні – у Сібіры, куды сам паехаў як на радзіму, то «разам са смерцю знікла і ўсякая памяць пра яго, нібыта ніколі і не жыў ён на зямлі» [3, с. 84]. Не засталося і следу ад жыцця Чамаданава, як не было ў ім і сэнсу: была толькі чарада знешніх падзей. Але калі ўнутры чалавека нічога няма, то і ён нічога не значыць для свету, бо таямніца павінна быць не толькі ў знешнім наваколлі – як у апавяданні, у выглядзе невядомага Рока, але і ў душы асобы. Існуе і другі, больш злабадзённы сэнс у дадзенага твора, які робіцца відавочным пасля прачытання апошняй фразы – ускліку наратара («... і толькі цары і героі ў чаканні стаялі, рыхтуючыся да трагічнай барацьбы. Цары і героі!» [3, с. 84]) – і звяртання ўвагі на дату напісання твора (1916 год). Атрымліваецца, што адначасова Андрэеў узнімае праблему існавання «маленькага» чалавека ў сучасных для яго ўмовах – перадзелу свету падчас Першай сусветнай вайны: у барацьбе сусветных дзяржаў няма спаважнага месца нязначнаму, простаму чалавеку.

Сярод твораў М. Гаэцкага, што акцэнтуюць падобныя пытанні чалаваечых лёсаў і самаўспрымання асобы асабліва яскрава вылучаецца апавяданне "Габрыелевы прысады" (1917). У ім паказваецца адноснасць чалавечых спраў, пераацэнка іх па значнасці на фоне жыццёвых дробязяў і няспынным колазвароце гісторыі. Тое, што здаецца надзвычай важным у адзін момант жыцця, праз некалькі гадоў адыходзіць у нябыт (п'янства, грахі Габрыеля). І наадварот, вонкава непатрэбнае, дзівацкае – прага героя да пасадкі дрэў, якую не разумелі людзі – з часам набывае найвышэйшы сэнс, становіцца «прысадамі жыцця» [4, с. 215] праз гады для апавядальніка. Але і прысадам, паводле законаў лёсу, надыдзе час саступіць месца для нечага іншага. Пісьменніку ўдалося добра адлюстраваць гэтую парадаксальнасць рэчаіснасці і адноснасць чалавечых меркаванняў і ўражанняў.

Атрымліваецца, што нейкія звышнатуральныя праявы жыцця могуць паўплываць на лёс чалавека, унесці ў яго душу новыя перажыванні, узбагаціць яе, падштурхнуць да добрых спраў. У творы сцвярджаецца неспасціжная і вечная каштоўнасць жыцця, якое складваецца і з «каравага, чорнага і аграмаднага» [4, с. 213], і з «гарманічнага, музыкальнага і харошага» [4, с. 213], якія адчуліся малому хвораму Габрусіку і засталіся ў яго душы, падштурхнулі насаджаць дрэвы, лёс кожнага з якіх, як і чалавечае жыццё, непрадказальны, але па-свойму каштоўны. Тое, што здарылася з героем, немагчыма лагічна патлумачыць, але, напэўна, адчуванне цудоўнай таямніцы, успрыманне жыцця як цуду і спарадзіла ў Габрыеля звычку няспынна садзіць дрэвы. Аднак як непрадсказальны лёс дрэва, так і чалавечае жыццё можа па-рознаму павярнуцца. Для Габрыеля прысады з цягам часу згубілі свой «патаемны» сэнс. Нездарма герой-апавядальнік паказвае яго як вялікага «грэшніка, баламута, п'яніцу, картэўніка, гуляку» [4, с. 212]. А ўвогуле ў структуры апавядання даволі празрыста чытаюцца элементы жыційнага жанру, толькі акрамя цуду ўсе падзеі падаюцца з адваротным, негатыўным сэнсам. Але таму жыццё і таямнічая з'ява, што шляхі яго нязведаны. І ўжо не Габрыель у цэнтры ўвагі апавядальніка, а яго ўласны лёс, які невядома куды завядзе. Асноўную думку апавядання мы бачым у тым, што ў непрадказальнасці жыццёвых дарог, у іх недасканаласці, якая складваецца адначасова і з гарманічнага, і з «каравага», калечанага, а таксама ў рэдкіх перамогах светлага боку жыцця над цёмным і заключаецца жыццёвае хараство і прыцягальнасць.

Варта таксама звярнуць увагу на прасторава-часавыя асаблівасці апавяданняў пісьменнікаў. Для твораў Л. Андрэева ў адлюстраванні асобы характэрным становіцца вобраз штучна ствараема-



Рэпазіторый БДУ

га лабірынту: груканне ў дзверы (“Призраки”, “Возврат”), бясконцае блуканне па калідорах або вуліцах горада ў марных спробах дасягнуць ілюзорнай мэты (“Возврат”, “Проклятие зверя”) або па краінах свету (“Чемоданов”). Падобныя матывы маюць сімвалічнае значэнне блукання ўсляпую па жыцці, у якім вышэйшыя сілы безуважныя да чалавека. Чалавек робіць марную спробу кіраваць сваім жыццём, ён толькі лялька ў руках жорсткага лёсу.

Іншыя пазнакі хранатопа сустракаем у апавяданнях М. Гарэцкага, для якога мастацкая прастора мясцовасці становіцца найважнейшай перадумовай маральнага стану асобы. Найбольш часты для яго апавяданняў – хранатоп хаты і вёскі. Дабрабыт чалавека цесна звязаны з месцам: калі ёсць месца, дом, то ёсць і чалавек або памяць пра яго (“Габрыелевы прысады”). Калі ўсё разбурана, то наратар спрабуе, прынамсі, успомніць, уявіць людзей, звязаных з гэтай мясцовасцю (“Руіны”, “Разбураныя хаты”).

Такім чынам, агульныя для абодвух пісьменнікаў прыёмы сну і сродкі стварэння ілюзорнасці быцця праз розныя хранатапічныя прыкметы акцэнтуюць розныя, амаль процілегла накіраваныя светаадчувальныя мадэлі. Калі ў Л. Андрэева матывы блукання, вобразы лабірынту выяўляюць страту чалавекам свайго месца ў свеце, яго разгубленасць і бездапаможнасць, то ў М. Гарэцкага асоба героя або наратара добра ўсведамляе сваю сувязь з роднай мясцовасцю, спроба захаваць якую становіцца вызначальнай для яе ўсведамлення свайго месца ў ходзе быцця, у сусвеце.

**Крыніцы**


1. Андреев, Л. Н. В поезде [Электронный ресурс] / Л. Н. Андреев // Lib.Ru: Классика. – Режим доступа: http://az.lib.ru/a/andreew_l_n/text_0132.shtml. – Дата доступа: 09.02.2014.
2. Андреев, Л. Н. Собрание сочинений : в 6 т. / Л. Н. Андреев. – М. : Худож. лит., 1990 – 1996. – Т. 2. : Рассказы; пьесы. 1904 – 1907. – 1990. – 559 с.
3. Андреев, Л. Н. Собрание сочинений : в 6 т. / Л. Н. Андреев. – М. : Худ. лит., 1990 – 1996. – Т. 5. : Рассказы; пьесы 1914 – 1915; сатирические миниатюры для сцены 1908 – 1916. – 1995. – 511 с.
4. Гарэцкі, М. І. Збор твораў : у 4 т. / М. І. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984 – 1986. – Т.1.: Апавяданні 1913 – 1930. – 1984. – 446 с.



**L.Y. Hlazman**
VSU named after P.M. Masherov
e-mail: Lubov_glazman@bk.ru


**Artistic Techniques for Representation a Personal World Attitude in the Stories by M. Haretsky and L. Andreyev**


*Key words: M. Haretsky, L. Andreyev, short story, personality's attitude to the world, illusory nature.*

*The article explores the artistic means and methods of displaying the personality's world attitude in M. Haretsky's and L. Andreev's stories. In representation of a personal statement in the stories, the most important functions are performed by artistic conventionality with accented phantasmagoria, the illusory nature of being (which are similar in the works of both authors), the space-time organization of the stories (which are different in the prose of M. Goretsky and L. Andreev).*



**В.В. Гниломедов, Н.В. Микулич**
Центр исследований белорусской культуры, языка и литературы НАН Беларуси
e-mail: mikmik43@gmail.com



УДК 821.161.1(476).09“19/20”


## СОВРЕМЕННАЯ РУССКОЯЗЫЧНАЯ ПОЭЗИЯ БЕЛАРУСИ: ТВОРЧЕСКАЯ ИНДИВИДУАЛЬНОСТЬ И ЛИТЕРАТУРНЫЙ ПРОЦЕСС


*Ключевые слова: идейно-эстетические традиции, преемственность, творческая индивидуальность, развитие, историко-литературный процесс, система.*



*В статье раскрываются характерные особенности современной русскоязычной поэзии Беларуси как уникального явления на литературной карте Европы, составной части одновременно белорусского и русского социокультурного дискурса. Анализируются творческие поиски наиболее значимых русскоязычных авторов, представителей разных литературных регионов, поколений и творческих школ – В. Блаженного, И. Котлярова, Г. Трестмана, В. Поликаниной, А. Габриэля, Е. Крикливец. Отмечается склонность поэтов к осмыслению духовно-нравственного мира личности, вечных проблем жизнедеятельности человека, их заангажированность в актуальные противоречия общественно-социальной действительности, обращается внимание на поэтико-стилевую парадигму художественного слова и т.д.*


Современная русскоязычная поэзия Беларуси – уникальное явление на литературной карте Европы. Продуцируя на почве белорусских и русских духовно-социальных и литературно-

Репозиторий ВГУ